**ПШЧО́ЛКА** Аляксандр Раманавіч (1869, в. Чарсцвяты Ушацкага р-на — 1943), пісьменнік, этнограф, фальклорыст. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю (1890), юрыдычны факультэт Юр'еўскага (Тартускага) універсітэта (1907). Працаваў настаўнікам, адвакатам у Віленскай, Курляндскай і Эстляндскай губернях. У 1-ю сусветную вайну пераехаў на Віцебшчыну (Гарадок, Полацк). З 1928 жыў у г.п. Старая Таропа Калінінскай вобл. (Расія). Друкаваўся з 1898 у «Витебских губернских ведомостях», у газетах «Сельский вестник», «Минское слово», «Белорусская жизнь», у часопісе «Крестьянин» і інш. Пісаў на бел. і рускай мовах. Выдаў больш за 10 кніг апавяданняў і нарысаў, дзе паказаў жыццё і побыт бел. сялян канца 19 ст. Шмат падарожнічаў па Лепельшчыне. У этнаграфічных нарысах апісваў жыццё, побыт, звычаі і абрады сялян гэтага краю. Дасканалае веданне мясцовай гаворкі дазваляла яму дакладна перадаваць простую мову герояў, творы вуснай паэзіі. Нарыс «Дзяды» (1898) прысвечаны абраду Памінання памерлых родзічаў. У «Мікітавых хаўтурах» (1901) апісаў пахаванне селяніна, прывёў тэксты галашэнняў па нябожчыку. П. не ўдалося разглядзець гуманістычную сутнасць гэтага абраду, у выніку спрошчаны, павярхоўны падыход прывёў да скажонага паказу рэчаіснасці. Артыкул «Талака» (1903) аб'ектыўна раскрыў своеасаблівую форму сялянскай узаемадапамогі. У нарысе «Зажынкі і абжынкі» (1903) паказаў розныя этапы земляробчага абраду, выкарыстаў шматлікія тэксты бел. жніўных песень, спевы сляпых жабракоў; для яго характэрна добрае адчуванне нар. культуры. У цыкле нарысаў «Пісьмы з вёскі» (1907) адлюстравалася непаслядоўнасць і супярэчлівасць аўтарскай пазіцыі ў адносінах да народа, што выявілася ў падкрэсліванні цёмных і адмоўных бакоў сялянскага побыту і характараў, абстрактным маралізатарстве. Каштоўнасць нарысаў у змешчаных там павер'ях і легендах. Нарыс «Беларускія святы» (1912) уяўляе спробу апісання нар. календара сялян Лепельшчыны. У Полацку стварыў хор, які выконваў бел. нар. песні, у Вільні арганізаваў вечар бел. нар. музыкі. Пад рэдакцыяй П. выдадзена паэма «Тарас на Парнасе» (3 выд., 1910).

*Тв.:* Очерки из жизни белорусской деревни. Витебск, 1899; Пилипово веселье: (Бел. очерк). Витебск, 1901; Белорусские рассказы. Витебск, 1901; Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни. 2 изд. Вильна, 1906; Очерки и рассказы из жизни Белоруссии. Сб. 2. 2 изд. Витебск, 1910.

*Літ.:* Васілевіч У.А. Збіральнікі. Мн., 1991. С. 70—87.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ